# ДРУГОЕ ПАСЛАННЕ СВЯТОГА ЯНА

## Прывітанне

**1** 1 Старэйшына – да Выбранай Пані і яе дзяцей, якіх я люблю ў праўдзе, і
не толькі я, але і ўсе, хто пазнаў праўду 2 дзеля праўды, якая трывае ў нас і будзе
з намі навекі. 3 Ласка, міласэрнасць ды спакой ад Бога і ад Езуса Хрыста, Сына
Айца, няхай будзе з намі ў праўдзе і любові.

## Заклік да любові

4 Я вельмі ўзрадаваўся, што знайшоў сярод тваіх дзяцей такіх, якія
паступаюць згодна з праўдаю паводле запаведзі, якую мы атрымалі ад Айца. 5 І
цяпер прашу цябе, Пані, не як новую запаведзь пішучы табе, але тую, якую
маем ад пачатку, каб мы любілі адзін аднаго. 6 Любоў заключаецца ў тым, каб
мы паступалі паводле Ягоных запаведзяў. А запаведзь гэтая тая, якую вы чулі
ад пачатку, каб вы паступалі паводле яе.

## Перасцярога перад фальшывымі настаўнікамі

7 Бо шмат ашуканцаў прыйшло ў свет, якія не прызнаюць, што Езус Хрыстус
прыйшоў у целе. Такі ёсць ашуканцам і антыхрыстам. 8 Зважайце на сябе, каб
вы не страцілі таго, над чым мы працавалі, але каб атрымалі поўную
ўзнагароду. 9 Кожны, хто выходзіць наперад і не трывае ў вучэнні Хрыста, не
мае Бога. Хто ж трывае ў вучэнні, той мае і Айца, і Сына.

10 Калі хто прыходзіць да вас і не прыносіць гэтага вучэння, не прымайце яго
ў дом і не вітайце. 11 Хто прывітае яго, той удзельнічае ў яго дрэнных справах.

## Заканчэнне

12 Пра многае маю напісаць вам, але не хачу на паперы атрамантам, бо
спадзяюся быць у вас і паразмаўляць з вамі, каб радасць нашая была поўнай.

13 Вітаюць цябе дзеці тваёй Выбранай Сястры.

© Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, Мінск 2017